УДК 63.3(2)613(4Беи)
ББК 947.084.63(476)
Ш678

Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета БДПУ імя М. Танка

*Рэцэнзент У. І. Навіцкі*, доктар гістарычных навук, прафесар

**Шкуцько Л. Л., Сакалоў М. М.**

Ш678 Яўрэйская нацыянальная культура як частка сістэмы народнай асветы на Беларусі ў 1920—1930-я гады: Вучэб. дапам. — БДПУ імя М. Танка, 2001. — 30 с.

У дапаможніку на прыкладзе становішча яўрэйскай нацыянальнай адукацыі раскрываецца распрацоўка і ажыццяўленне нацыянальнай палітыкі на Беларусі ў 1920—1930-я гады. На аснове архіўных дадзеных і навуковых публікацый прыведзены звесткі аб існаванні яўрэйскай адукацыі ў сістэме агульнаадукацыйнай, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай школы.

Адрасуецца студэнтам вышэйшых навучальных устаноў, а таксама ўсім, хто цікавіцца праблемамі гісторыі міжнацыянальных адносін і адукацыі на Беларусі.

ББК 947.084.63(476)

© Л. Л. Шкуцько, М. М. Сакалоў, 2001
© Вокладка. А. А. Пакала, 2001

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт
імя Максіма Танка

**Л. Л. Шкуцько,
М. М. Сакалоў**

# ЯЎРЭЙСКАЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЯ КУЛЬТУРА ЯК ЧАСТКА СІСТЭМЫ НАРОДНАЙ АСВЕТЫ НА БЕЛАРУСІ Ў 1920—1930-Я ГАДЫ

*Вучэбны дапаможнік*

Мінск 2001

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Семінарыя падтрымлівала кантакты з яўрэйскімі супольнасцямі ўсяго СССР. Паміж 1925 і 1928 гг. яна накіравала ім 48 сваіх выпускнікоў. Аднак зімой 1928—1929 гг. невельская семінарыя рабінаў была выяўлена і зачынена ўладамі, а яе духоўны лідэр рабін Шмуль Левітан трапіў у Сібір на высылку[1].

Другім накірункам антыклерыкальнай дзейнасці была барацьба супраць сінагог і рабінаў. Ужо ў пачатку 20-х гг. пачынаюць у масавым парадку зачыняць сінагогі. Так, калі ў 1917 г. на Беларусі дзейнічала 704 сінагогі, то да другой паловы 1936 г. было зачынена 633. Ужо ў 1924 г. Мінская харальная сінагога была пераабсталявана ў клуб. Падобны лёс напаткаў многія сінагогі, якія пасля канфіскацыі пераўтвараліся ў клубы, тэатры і склады. Усяго па Мінску з 63 сінагог было зачынена 53, у Віцебску з 51 — 42, у Магілёве з 17 — 13. Многія рабіны былі арыштаваны, а маёмасць сінагог, сярод якой было шмат каштоўнасцей, помнікаў старажытнасці і культуры, вывезена. Толькі з сінагогі Мінска ў 1922 г. было канфіскавана два пуды срэбра[2].

Такім чынам, традыцыйная рэлігійная адукацыя яўрэяў фактычна была разгромлена, а замест яе хуткімі тэмпамі стваралася савецкая сістэма адукацыі.

## ЯЎРЭЙСКАЯ ШКОЛА Ў СІСТЭМЕ АДУКАЦЫІ БССР

На працягу 20-х гг. у БССР яўрэйская адукацыя на ідыш увахodзіла ў агульную структуру народнай асветы рэспублікі. Гэта адпавядала абранай нацыянальнай палітыцы, якая прадэкларавала роўныя магчымасці для развіцця нацыянальных культур. Разам з тым, дзеці яўрэйскай нацыянальнасці мелі даволі шырокія магчымасці карыстацца таксама агульнаадукацыйнай школай, якая стваралася ва ўмовах беларусізацыі.

На фарміраванне яўрэйскай сістэмы адукацыі на Беларусі накладваў свой адбітак тэрытарыяльны падзел рэспублікі. Першыя яўрэйскія школы на савецкай тэрыторыі беларускіх зямель з'яўляюцца ўжо ў 1918—1919 гг. на Гомельшчыне, Магілёўшчыне і Віцебшчыне, якія ўваходзілі ў склад РСФСР. Таму ў 1920 г., калі толькі пачыналася школьнае будаўніцтва на тэрыторыі БССР, у беларускіх раёнах Расіі

[1] Фішман Д. Лёс іудаізму ў Савецкай Беларусі (1920—1930) //Беларусіка. Кн. 4. Мн., 1995. С. 115.

[2] Иоффе Э. Г. Страницы истории евреев Беларуси. Мн., 1996. С. 94.



было ўжо 62 яўрэйскія школы. Да канца таго ж года ў БССР існавала ўжо 19 такіх школ. У наступным 1921—1922 навучальным годзе яўрэйскіх школ было больш за 100, у іх навучалася 10 745 чалавек[1].

Яўрэйскія школы былі менавіта такімі не толькі па складу навучэнцаў, але і па мове выкладання і змесце вучэбных прадметаў, якія ўвасаблялі сабой нацыянальную адметнасць, садзейнічалі захаванню нацыянальнай свядомасці. Разам з тым ва ўмовах беларусізацыі ва ўсіх нацыянальных школах, у тым ліку і яўрэйскіх, абавязкова вывучалася і беларуская мова. Напрыклад, у II—III класах сямігодак на яе адводзілася 5 гадзін у тыдзень, у IV—V класах — 4 гадзіны, у VI—VII — па 3 гадзіны.

Далейшы лёс нацыянальных школ у 30-я гг. быў вызначаны агульнымі зменамі ў палітычным жыцці, узмацненнем барацьбы з "нацыяналізмам" і "касмапалітызмам", што рэзка змяніла адносіны да нацыянальных форм школьнай адукацыі. Пасля Пастановы СНК і ЦК ВКП(б) ад 13 сакавіка 1938 года "Аб абявязковым вывучэнні рускай мовы ў школах нацыянальных рэспублік і абласцей" пачалася ліквідацыя нацыянальных навучальных устаноў. З ліпеня 1938 г. пасля адпаведнага рашэння ЦК Кампартыі Беларусі пачынаецца пераўтварэнне яўрэйскіх, польскіх і іншых школ нацыянальных меншасцей рэспублікі ў рускія і беларускія школы. Так, у Віцебскай вобласці ў другой палове 1938 г. былі рэарганізаваны ўжо 32 яўрэйскія школы. Тое ж самае адбывалася і ў іншых рэгіёнах рэспублікі. Фактычна ўжо ў 1939 г. у БССР не існавала сетка агульнаадукацыйных школ на мовах нацыянальных меншасцей[2].

Разам з тым, патрэбна разумець, што значная частка яўрэйскіх сем'яў пасылала сваіх дзяцей у агульнаадукацыйныя беларускія школы, выкарыстоўвала для адукацыі існаваўшую ў БССР сістэму школ. Тлумачылася гэта тым, што навучанне ў такіх школах стварала большую перспектыву для атрымання наступных узроўняў адукацыі.

Развіццё сістэмы адукацыі ў 20-я гг. у БССР спрыяла стварэнню нацыянальных школ розных узроўняў, колькасць якіх паступова павялічвалася. У 1922—1923 гг. працавала 13 яўрэйскіх дзіцячых садкоў, 21 яўрэйскамоўны дзіцячы дом. Праз некалькі гадоў, у 1927—1928 навучальным годзе, згодна са статыстычнымі данымі, з 62 дзіцячых садкоў, якія знаходзіліся ў падпарадкаванні акруговых аддзелаў адукацыі, на

[1] Дардак Ю. Да гісторыі яўрэйскай школы ў БССР //Асвета. 1927. № 3. С. 171.

[2] Яцкевіч С. Лёс адукацыі нацыянальных меншасцяў на Беларусі //Весці АНМ. 1997. № 3. С. 7.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ